УДК 94(476)«1941/1944»

# ХАРАКТАРЫСТЫКА АСАБОВАГА СКЛАДУ БЕЛАСТОЦКАГА ПАРТЫЗАНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ (1943–1944 гг.)


## *І. В. Чарняўскі*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г.Мінск, Беларусь, cherny-95@mail.ru.*



У гады Вялікай Айчыннай вайны барацьба с захопнікамі вялася на тэрыторыі ўсіх абласцей Беларусі. У тым ліку і ў найбольш выдаленай на захад Беластоцкай вобласці. Хуткія тэрміны, у якія праціўнік захапіў яе летам 1941 г., гістарычныя прычыны, асаблівасці этнічнага складу мясцовага насельніцтва ў сукупнасці пакінулі свой след у развіцці тут партызанскага руху. Першыя фарміраванні скласліся тут ужо ў першы год вайны, аднак да 1943 г. яны былі нешматлікія і не мелі цэнтралізаванага кіраўніцтва. Адужэўшы ў дачыненні да асабістага складу і ўзбраення ў выніку шэрагу рэйдаў з цэнтральных абласцей БССР, партызанскія атрады і брыгады Беластоцкай вобласці да 1944 г. сталі ўяўляць сабой значную сілу ў варожым тыле. Народныя мсціўцы гэтага рэгіёну змагаліся з акупантамі да самага прыходу РСЧА ўлетку 1944 г. і ўнеслі свой уклад у перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. Якія асаблівасці меў асабісты склад Беластоцкага партызанскага злучэння, будзе адлюстравана ў дадзеным артыкуле.



***Ключавыя словы:*** Вялікая Айчынная вайна; партызанскі рух; Заходняя Беларусь; Беластоцкая вобласць; асабовы склад.


# ХАРАКТЕРИСТИКА ЛИЧНОГО СОСТАВА БЕЛОСТОКСКОГО ПАРТИЗАНСКОГО СОЕДИНЕНИЯ (1943–1944 гг.)


## *И. В. Чернявский*

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, cherny-95@mail.ru.*



В годы Великой Отечественной войны борьба с захватчиками велась на территории всех областей Беларуси. В том числе и в наиболее удалённой на запад Белостокской области. Быстрые сроки, в которые противник захватил её летом 1941 г., исторические причины, особенности этнического состава местного населения в совокупности оставили свой след в развитии здесь партизанского движения. Первые формирования сложились здесь уже в первый год войны, однако вплоть до 1943 г. они были немногочисленны и не имели централизованного руководства. Окрепнув в отношении личного состава и вооружения в ходе целого ряда рейдов из центральных областей БССР, партизанские отряды и бригады Белостокской области к 1944 г. стали представлять собой значительную силу во вражеском тылу. Народные мстители этого региона боролись с оккупантами до самого прихода РККА летом 1944 г. и внесли свой вклад в победу в Великой Отечественной войне. Какие особенности имел личный состав Белостокского партизанского соединения, будет отражено в данной статье.



***Ключевые слова:*** Великая Отечественная война; партизанское движение; Западная Беларусь; Белостокская область; личный состав.

PECULIARITIES OF STUDYING PARTISAN FORMATIONS OF WESTERN BELARUS (1941–1942)

*I. V. Charniauski*

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: cherny-95@mail.ru.*

During the Great Patriotic War, the struggle against the invaders was fought on the territory of all regions of Belarus. Including in the most remote to the west of the Bialystok region. The fast time frame in which the enemy captured it in the summer of 1941, the historical reasons, the peculiarities of the ethnic composition of the local population in the aggregate left their mark on the development of the partisan movement here. The first formations were formed here in the first year of the war, but until 1943 they were few in number and did not have a centralized leadership. Having strengthened in terms of personnel and weapons during a number of raids from the central regions of the BSSR, partisan detachments and brigades of the Bialystok region by 1944 began to represent a significant force in the enemy rear. The people's avengers of this region fought against the occupiers until the arrival of the Red Army in the summer of 1944 and made their contribution to the victory in the Great Patriotic War. What features the personnel of the Bialystok partisan unit had will be reflected in this article.

***Key words:*** the Great Patriotic War; partisan movement; Western Belarus; Bialystok region; personnel.

Для развіцця партызанскага руху ў Беластоцкай вобласці і стварэння там баяздольных фарміраванняў у першай палове 1943 г. пад кіраўніцтвам ЦК КП (б) Б з савецкага тылу быў накіраваны цэлы шэраг невялікіх арганізатарскіх груп. Аднак належнага выніку гэта не дало. Частка гэтых груп загінула, а большасці, якія дабраліся да месца прызначэння, выканаць пастаўленыя задачы не ўдалося. Тады была абраная іншая тактыка: перавод ужо створаных і дзейнічаўшых партызанскіх фарміраванняў з цэнтральных і ўсходніх рэгіёнаў Беларусі ў заходнія. Гэта было абумоўлена наступнымі меркаваннямі: не трэба было марнаваць час на падбор асабовага складу, яго навучанне і ўзбраенне. Акрамя таго, баявы вопыт нічым не заменіш, а ён у іх меўся [6, с. 97].

Ядро будучага Беластоцкага партызанскага злучэння аформілася ў ходзе рэйду пад камандаваннем Ф. Ф. Капусты (верасень–лістапад 1943 г.), які праходзіў па тэрыторыі 4 абласцей і працягваўся 80 дзён. Па стане 31.08.1943 г., г.зн. за дзень да выхаду ў баявы паход, у яго складзе значыліся наступныя партызанскія фарміраванні: атрад «Баявы» (камандзір: Я. П. Грыцыневіч) – 201 чал. (37 камандзіраў і 164 радавых); атрад ім. Неўскага (камандзір: К. М. Ешчанка) – 140 чал. (27 камандзіраў і 113 радавых); атрад ім. Будзёнага – 114 чал. (21 камандзір і 93 радавых); атрад «За Радзіму» (камандзір: М. Р. Янкоўскі) – 177 чал. (29 камандзіраў і 148 радавых); атрад Трацэўскага (камандзір: С. І. Талмачоў) – 73 чал. (8 камандзіраў і 65 радавых); штаб – 40 чал. (9 камандзіраў і 31 радавы). Агульная колькасць складала 745 чал. (131 камандзір і 614 радавых) [2, с. 3].

Падрыхтоўка да рэйду не была спешнай і заняла каля 2 тыдняў. Злучэнне мела сярэднюю колькасць у асабовым складзе, пры гэтым было дастаткова ўкамплектавана камандзірамі. Адказная падрыхтоўка да рэйду дазволіла

пазбегнуць вялікіх беззваротных страт сярод партызан. Дзякуючы актыўнай растлумачальнай працы сярод мясцовага насельніцтва у ходзе рэйду большасць баявых адзінак папоўніліся новымі байцамі і колькасна адужэлі.

Была праведзена вялікая праца па аб'яднанні цэлага шэрагу асобных партызанскіх фарміраванняў. Гэта палепшыла іх арганізацыю, кіраванне і, як следства, якасць дзейнасці. Так, па стане на 01.12.1943 г. сітуацыя ў лічбах выглядала наступным чынам: атрад «Баявы» ім. Дунаева (было 201 чал. – стала 229 чал.); атрад ім. Будзёнага (было 114 чал. – стала 157 чал.); атрад ім. Жукава (было 73 чал. – стала 85 чал.); брыгада ім. Чапаева (без зменаў: 438 чал.). Акрамя таго, у ходзе рэйду з атрада ім. Неўскага была створана аднайменная брыгада (камандзір: К. М. Ешчанка) (было 140 чал. – стала 282 чал.); з атрада «За Радзіму» была створана брыгада «У імя Радзімы» (камандзір: М. Р. Янкоўскі) (было 177 чал. – стала 194 чал); на базе атрадаў, якія дзейнічалі самастойна ў Ліпічанскай пушчы, была створана брыгада «Пралетарыят» (камандзір: М. К. Вайцяхоўскі) (189 чал.), а таксама падпарадкаваны атрад ім. Калініна (132 чал.) [3, с. 7]. У выніку рэйду пад кіраўніцтвам Ф. Ф. Капусты афармілася аснова злучэння Беластоцкай вобл., якое будзе паспяхова дзейнічаць у тыле ворага да яго выгнання летам 1944 г. У далейшым быў здзейснены яшчэ шэраг пераходаў, пасля якіх яно было ўмацавана колькасна.

У снежні 1943 г. асобны атрад ім. Жукава быў перадыслакаваны баявымі групамі ў паўднёвую частку Аўгустоўскіх лясоў, дзе прыступіў да баявых дзеянняў. Усяго да канца года ў ім паспела паваяваць 100 чал. [4, с. 89–116].

Туды ж, у Аўгустоўскія лясы, у снежані 1943 г. баявымі групамі быў перадыслакаваны асобны атрад ім. Будзёнага. Усяго да канца года ў яго шэрагах паспела паваяваць 182 чал. [5, с. 1–42].

Крайні па часе рэйд у 1943 г. на тэрыторыю Беластоцкай вобласці ажыццявіла брыгада ім. Панамарэнкі (камандзір: С. Н. Іваноў). Выконваючы загад БШПР аб перадыслакацыі, у пачатку снежня яна са Старадарожскага р-на Мінскай вобласці выступіла ў паход у накірунку Заходняй Беларусі. На мяжы 1943/1944 гг. у брыгадзе ім. Панамарэнкі налічвалася 500 чал. асабовага складу [1, с. 56].

Таксама восенню 1943 г. пад кіраўніцтвам ЦК КП (б) Б і Беластоцкага падпольнага абкама партыі былі створаны Аўгустоўскі, Бранскі, Лапскі, Чыжэўскі міжраённыя камітэты КП (б) Б, а таксама Ваўкавыскі, Гродзенскі, Ломжынскі, Свіслацкі, Скідзельскі, Снядаўскі і Сапоцкінскі падпольныя райкамы КП (б) Б. Яны надалі асаблівую ўвагу папаўненню новымі байцамі асабовага складу партызанскіх груп, атрадаў і брыгад. Акрамя таго, у цэнтры іх увагі было пытанне ўзмацнення партыйнага кіраўніцтва барацьбой ў варожым тыле на тэрыторыі Беластоцкай вобласці. Да моманту прыходу Чырвонай Арміі ўлетку 1944 г. агульная колькасць партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на дадзенай тэрыторыі, складала больш за 4 000 чалавек [6, с. 100].

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. НАРБ. Ф. 1400. Воп. 1. Спр. 54. Боевой приказ № 05 Красно-партизанской бригады им. Пономаренко от 09.12.1943 г.
2. НАРБ. Ф. 1400. Воп. 1. Спр. 4. Сведения о боевом и численном составе бригады специального назначения на 31.08.1943 г.

3. НАРБ. Ф. 1400. Воп. 1. Спр. 5. Сведения о боевом и численном составе группы партизанских отрядов и бригад Белостокской обл. на 01.12.1943 г.

4. НАРБ. Ф. 1400. Воп. 1. Спр. 121. Список личного состава отдельно действующего партизанского отряда им. Жукова Белостокской обл. , 1943-1944 гг.

5. НАРБ. Ф. 1400. Воп. 1. Спр. 114. Список личного состава отряда им. Будённого Белостокской обл., 20.07.1944 г.

6. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941-июль 1944) : краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / [А. Л. Манаенков и др.] ; Институт истории партии при ЦК КП Белоруссии − филиал Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. Минск : Беларусь, 1983. 763 с.